# Прыгоды і каханне




**Бутэвіч, А. Каралева не здраджвала каралю, або Каралеўскае шлюбаванне ў Навагародку / Анатоль Бутэвіч. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. — 320 с. — (Святло мінуўшчыны).**

Займальны аповед пра прыгоды і каханне 17-гадовай беларускай князёўны Соф'і Гальшанскай і 70-гадовага вялікага князя літоўскага і караля польскага Ягайлы, чацвёртае шлюбаванне якога адбывалася ў беларускім Навагрудку ў лютым 1422 года. У выніку ў Польшчы запачаткавалася вядомая на ўсю Еўропу каралеўская Ягелонская дынастыя.

У рамане цесна пераплецены палітыка і каханне, інтрыгі і канфлікты, замешаныя на абвінавачваннях у здрадзе кожнай з чатырох жонак Ягайлы. Нават Соф'і давялося прылюдна даказваць, што яна не здраджвала каралю.




**Гардзей, В. Трыадзінства: кніга паэзіі / Віктар Гардзей. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2010. — 319 с. — (Залатое пяро).**

Класічная формула паэзіі: адзінства трох паняццяў — думкі, вобраза, слова. Гэта для самога творцы, а для чытача ўсё наадварот — трыадзінства слова, вобраза, думкі. У паэзіі Віктара Гардзея надзвычай цеснае спалучэнне часу, месца і дзеяння, што дыктуецца абвостраным адчуваннем чужой і сваёй бяды, самоты, і як вынік — нашай агульнай і непапраўнай віны: «І ёсць яна, Вялікая Журба, калі пастрояць грэшных у калоны; і прахрыпіць апошняя труба, і выбегуць, як сцішыцца мальба, заместа коней вараныя клоны».




**Праўдзін, В. Нелюбімыя гінуць / Віктар Праўдзін. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2010. — 375 с. — (Залатое пяро).**

Раман Віктара Праўдзіна "Нелюбімыя гінуць" надзвычай сучасны, глыбока псіхалагічны і ў значнай меры сентыментальны. У цэнтры ўвагі аўтара — лёсы трох жанчын.

Люба Анікейчык, прывабная вясковая беларусачка, ад побытавай безвыходнасці і няўдалага кахання вярбуецца на заробкі ў Германію, дзе ёй наканавана стаць "сэксуальнай забаўкай".

Другая — маладая чачэнка Айшэ, нелюбімы муж-гвалтаўнік якой гіне, пакідаючы цяжарную жанчыну ва ўмовах вайны працягваць яго род.

Мінчанка Марыя па віне п'янага мужа ў мядовы месяц трапляе ў аўтакатастрофу і застаецца бязногай калекаю. Ад нявесты зняволены нарачоны адмаўляецца. Спустошаная маральна, жанчына выбірае шлях распусты.

У рамане чаргуюцца нямецкія, чэчэнскія, беларускія раздзелыкарціны, сюжэт востры, напружаны.

У кнігу ўключана таксама вядомая далёка за межамі Беларусі дэтэктыўна-прыгодніцкая аповесць "Эксгумацыя".

**Падрыхтавала Анастасія КРЫШЧЫК, бібліятэкар аддзела абанемента Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага.**

**Вядучая выпуску — Тамара МАЗУР.**